# *Палявік*








***З пакалення ў пакаленне жыхары Струбніцы передавалі многія легенды і паданні. Сярод іх існуе легенда пра палевіка. Згодна з паданнем ён жыве ля старога магутнага дуба, які стаіць на пагорку непадалёку ад вёскі Струбніца. Тэрыторыя палевіка - гэта палі і лугі, што акружаюць гэты дуб-старажыл. Старыя людзі кажуць, што дзейнасць палевіка накіравана на адну толькі шкоду гаспадарцы чалавека.***

***Палявік разбурае загародкі, каб прыманіць да сябе скаціну, прыгінае да зямлі збажыну і траву, скручвае расліны, адхіляе дождж, засылае шкодных насякомых на пасевы. Ён вельмі не***

*любіць, калі непасрэдна каля яго ўладанняў людзі апрацоўваюць зямлю. Наогул палявік не дазваляе чалавеку шмат часу праводзць на яго тэрыторыі.*

*Гэты злодзей, па расказах старажылаў, можа прымаць выгляд пачварнага ценю, які то гоніцца за чалавекам, то ідзе ад яго, заманьваючы за сабой ахвяру. Таму гэтае месца многія людзі імкнуцца абыходзіць бокам. І так робяць яны з даўніх часоў. А побач з адзінокім дубам няма ніводнага іншага дрэва. Шмат гадоў таму назад пракладваўся гасцінец на Ваўкавыск. Здарылася так, што ён павінен як раз праходзіць праз палеткі, дзе стаяў дужы адзінокі дуб, у кроне якога, па ўяуленні людзей, жыў палявік. Спачатку хацелі абмінуць гэтае д'ябальскае месца. Але будаўніцтва акружнога шляху патрабавала значна больш сродкаў, намаганняў і часу. Усё-такі было вырашана пракладваць гасцінец праз гэты "ненадзейны" палетак. Аднак ніхто не дапускаў думкі, каб спілаваць або пашкодзщь гэты чарадзейны дуб. Усе баяліся аднаго - помсты палевіка.*

*Адзін смяльчак з ліку тых, хто будаваў дарогу, калі было спякотна, прылёг у цень гэтага дуба. Як ні дзіўна, ён у цені дуба атрымаў сонечны ўдар. Пасля такога здарэння ніхто не набліжауся да дрэва.*

*Людзі лічылі яшчэ, што палявік лашчыць і закалыхвае людзей, якія прыпыняліся пад дрэвам, хаваючыся ад сонца, а потым насылае на іх ліхаманку. Калі ж чалавек хаваецца пад кронай дуба ў час дажджу ці навальцы, палявік наклікае маланкавыя стрэлы, якія часта пападаюць у дуб. Таму людзі імкнуліся з даўніх пор не хавацца ад дажджу пад дубам.*

*Старажылы расказвалі пра дзіўныя з'явы, якія адбываліся на гасцінцы пасля яго пабудовы. Аднойчы позна вечарам з Ваўкавыска вяртаўся на брычцы закаханы мясцовы пан са сваім цівуном. Калі яны праязджалі каля дуба, раптам распрагліся коні, пан з цівуном ледзь не пакалечыліся.*

*Не пашанцавала і купцам, якія ехалі на кірмаш у Ваўкавыск. Яны ехалі вельмі рана, Гасцінец ахутаў густы туман. Незаўважна параўняліся з дубам, іх панеслі коні. Адзін з купцоў зламаў нагу, другі параніў галаву. Падобныя падзеі адбываліся час ад часу, але кожны раз на гэтым месцы, калі праезджыя міналі адзінокі дуб ля дарогі, палявік як бы выбіраў са свайго*

*сховішча, каму зрабіць непрыемнасці, а каго абмінуць. Мясцовыя жыхары не змаглі растлумачыць загадкавасць гэтага месца, усё спісвалі на палевіка.*

*Павер'е захавалася да нашых дзён.Старыя людзі на ўсялякі выпадак стараюцца абмінуць гэтае месца. Так і стаіць на палетку гэты стары адзнокі дуб. Няма ранейшага гасцінца, пабудавана новая асфальтаваная дарога. Але засталіся ў памяці людзей падзеі, звязаныя з дубам, якія дайшлі да нашых дзён дзякуючы памяці патомкаў.*